**А.Л.Карацееў,** *дацэнт*

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАЦЭСУ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ БЕЛАРУСІ

## (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты)

У сучаснай сістэме вышэйшай адукацыі ў галіне мастацкай культуры падрыхтоўка спецыялістаў духавога мастацтва ў Беларусі ажыццяўляецца па двух асноўных кірунках:

1) навучанне спецыялістаў для прафесійнай сферы музычнага мастацтва ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

2) навучанне спецыялістаў для сферы аматарскай творчасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Кафедра, безумоўна, з'яўляецца тым асноўным навуковатворчым, метадычным цэнтрам, які ажыццяўляе падрыхтоўку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокакваліфікаваных спецыялістаў у сваёй галіне. Але, на наш погляд, трэба пашырыць ступень адказнасці выпускаючай кафедры. Яна павінна стаць таксама цэнтрам па апрабацыі сучасных тэхналагічна-вытворчых пошукаў па выніках арганізацыі вытворчай практыкі студэнтаў з улікам праблемных сітуацый, якія ўзнікаюць у навучальных установах ці творчых калектывах. Кафедра павінна быць таксама педагагічна-эксперыментальным цэнтрам, які здольны вызначаць прагрэсіўныя падыходы ў навучанні маладых спецыялістаў, забяспечыць укараненне ў практыку лепшых формаў папулярызацыі творчых дасягненняў сваёй галіны.

Падрыхтоўка спецыялістаў духавога мастацтва – гэта складаны працэс, і ў першую чаргу асноўнай праблемай з'яўляюцца высвятленне зместу метадычнага забеспячэння гэтага працэсу, вызначэнне яго арганізацыйна-метадычных кірункаў. На працягу ўсяго перыяду развіцця духавога мастацтва Беларусі існавалі тыя ці іншыя праблемы па развіцці творчых навыкаў выканаўцаў на духавых інструментах, тыя ці іншыя падыходы метадычнага, арганізацыйнага характару, якія дазвалялі апрабаваць прагрэсіўныя знаходкі па авалоданні пэўным духавым музычным інструментам.

Сучасны працэс удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтваў рэспублікі ўяўляе шматузроўневую сістэму. Гэтая сістэма ў значнай ступені вызначыла пераасэнсаванне традыцыйных падыходаў да арганізацыйных асаблівасцей і метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу ў вышэйшых установах культуры і мастацтваў.

Аналіз арганізацыйна-метадычнага забеспячэння спецыяльных дысцыплін для падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі дазваляе адзначыць, што вырашэнне арганізацыйна-метадычных пытанняў дае магчымасць спецыяльным выпускаючым кафедрам забяспечыць паэтапнае выкладанне матэрыялу курсаў па спецыяльных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драўляных, медных духавых і ўдарных інструментах на працягу ўсяго тэрміну навучання студэнтаў. Але адзначым, што навучанне студэнтаў па дысцыпліне "Чытанне нот з ліста і вывучэнне аркестравых партый" мэтазгодна пачынаць не ў пятым семестры, а ў другім, калі вывучаецца курс "Аркестравы клас". Адзначым таксама і праблемы, што датычацца вучэбна-метадычнага забеспячэння педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў, якія пасля заканчэння Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі атрымліваюць кваліфікацыю выкладчыка.

У час педагагічнай практыкі студэнты не могуць вырашаць элементарныя канкрэтныя пытанні. Гэта сведчыць аб тым, што недастаткова часу і ўвагі надаецца вывучэнню дысцыплін "Музычная педагогіка", "Методыка выкладання спецыяльнага інструмента", "Псіхалогія".

Важнай умовай арганізацыйна-метадычнага забеспячэння падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў з'яўляецца збалансаванае размеркаванне ў семестрах гадзін на семінарскія заняткі пасля выкладання асноўнага тэарэтычнага матэрыялу на лекцыях. Так, напрыклад, вывучэнне студэнтамі спецыяльнасці "інструментальная музыка (духавая)" курса "Гісторыя нацыянальнага і сусветнага выканаўства на духавых інструментах" у аб'ёме 20 лекцыйных і 12 семінарскіх вучэбных гадзін на працягу двух семестраў прадугледжвае выкладанне асноўнага лекцыйнага матэрыялу ў 8-м семестры ў аб'ёме 16 гадзін і яго замацаванне на семінарскіх занятках у аб'ёме чатырох гадзін у гэтым жа семестры. Завяршэнне лекцыйнага матэрыялу прадугледжана ў наступным, 9-м семестры ў аб'ёме толькі чатырох гадзін, але на працягу астатніх чатырох семінарскіх заняткаў у аб'ёме васьмі гадзін студэнты маюць магчымасць падвесці вынікі па засваенні аб'ёму курса. Для студэнтаў спецыяльнасці "духавыя інструменты" па такой жа дысцыпліне прадугледжаны вучэбным планам 54 гадзіны на лекцыйныя заняткі і 16 – на семінарскія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для аптымізацыі вучэбна-метадычнага забеспяэння падрыхтоўкі спецыялістаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў важна вызначыць праблемна-тэматычны змест лекцыйных курсаў. Так, напрыклад, для студэнтаў, якія рыхтуюцца атрымаць спецыяльнасць "інструментальная музыка (духавая)" і кваліфікацыю кіраўніка аматарскага аркестравага калектыву, распрацаваны тыя тэматычныя раздзелы, па якіх у практычнай дзейнасці мастацкіх калектываў існуюць пэўныя праблемы. Адзначым некаторыя тэмы: "Арганізацыйныя і метадычныя праблемы фарміравання аматарскага духавога аркестравага калектыву на першапачатковым этапе", "Поліфункцыянальная накіраванасць службовай дзейнасці кіраўніка аматарскага духавога аркестра", "Структура і асноўныя кірункі вучэбнага і творчага працэсу ў аматарскім духавым аркестры", "Праблемы арганізацыі і правядзення агульнааркестравых рэпетыцый аматарскага духавога аркестра" і інш.

Названыя тэмы з'яўляюцца абавязковымі для індывідуальных планаў выкладчыкаў. Гэтыя планы павінны прадугледжваць напісанне метадычных распрацовак, работу па развіцці навыкаў сумеснага ансамблевага і сумеснага аркестравага выканаўства; інструментоўкі; чытанні аркестравых партытур; дырыжыраванні і інш.).

У раздзеле "Арганізацыйна-метадычная работа" індывідуальнага плана неабходна прадугледжваць састаўленне раскладу індывідуальных (практычных, дробнагрупавых) заняткаў, распрацоўку пытанняў да семінарскіх заняткаў, падрыхтоўку дапаможных сродкаў навучання студэнтаў (адбор музычнага матэрыялу і запіс фанаграм ці відэаматэрыялаў да лекцыйных і практычных курсаў, выраб наглядных дапаможнікаў, табліц, падбор фотаматэрыялаў, буклетаў, праспектаў і інш.).

Такім чынам, вызначэнне зместу вучэбна-метадычнай, арганізацыйна-метадычнай работы выкладчыкаў на кафедры дазволіць на якасным узроўні забяспечыць працэс падрыхтоўкі будучых маладых спецыялістаў духавога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ